# Указ
# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

30 красавіка 2024 г. № 183 г.Мінск

Аб устанаўленні юбілейнага медаля

У азнаменаванне 30-годдзя ўтварэння Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

1. Устанавіць юбілейны медаль ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб юбілейным медалі ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“, яго апісанне і ўзор пасведчання да гэтага медаля (прыкладаюцца).

3. Фінансаванне расходаў на выраб юбілейных медалёў ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“ і пасведчанняў да іх ажыццявіць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

21

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
30.04.2024 № 183

# ПАЛАЖЭННЕ
аб юбілейным медалі ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“

1. Юбілейным медалём ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“ (далей – юбілейны медаль) узнагароджваюцца:

ваеннаслужачыя і грамадзянскі персанал Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (далей – Служба бяспекі) за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў;

ветэраны, якія праходзілі службу ў Службе бяспекі, іншыя асобы, у тым ліку замежных дзяржаў, за значны ўклад у развіццё і ўдасканальванне дзейнасці ў сферы дзяржаўнай аховы, арганізацыю ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і іншых арганізацый са Службай бяспекі.

2. Узнагароджанне юбілейным медалём ажыццяўляецца начальнікам Службы бяспекі.

3. Юбілейны медаль уручаецца начальнікам Службы бяспекі або па яго даручэнні яго намеснікам, начальнікамі структурных падраздзяленняў Службы бяспекі.

4. Асобам, якія ўзнагароджаны юбілейным медалём, выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору.

5. Юбілейны медаль носіцца на левым баку грудзей форменнага або цывільнага адзення і пры наяўнасці іншых медалёў размяшчаецца пасля юбілейнага медаля ”25 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“.

6. Паўторнае ўзнагароджанне юбілейным медалём не ажыццяўляецца. Дублікаты юбілейнага медаля і пасведчання да яго ўзамен згубленых не выдаюцца.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
30.04.2024 № 183

# АПІСАННЕ
юбілейнага медаля ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“

1. Юбілейны медаль ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“ (далей – юбілейны медаль) выпрабляецца з металу серабрыстага колеру і мае форму круга дыяметрам 33 мм.

2. У цэнтры вонкавага боку размешчаны геральдычны знак – эмблема Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь серабрыстага колеру, за выключэннем дэвізнай стужкі на эмблеме чырвонага колеру, знешняга поля шчыта васількавага колеру, рукаяці мяча чырвонага і серабрыстага колераў. У ніжняй частцы па акружнасці злева ад эмблемы – лічбы ”1994“, справа – ”2024“.

3. На адваротным баку юбілейнага медаля па акружнасці размешчаны перавіты каля асновы стужкай вянок, які складаецца злева з лістоў лаўра, справа – з лістоў дуба. У цэнтры – надпіс ”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“ у пяць радкоў.

4. Усе элементы юбілейнага медаля чаканяцца высокім рэльефам. Краі юбілейнага медаля абведзены борцікам.

5. Юбілейны медаль пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з пяцівугольнай калодкай, абцягнутай муаравай стужкай васількавага колеру шырынёй 24 мм. У цэнтры стужкі – палоскі чырвонага і зялёнага колераў шырынёй адпаведна 4 і 2 мм. Па краях стужкі – беларускі арнамент белага колеру шырынёй 3 мм.

На адваротным баку калодкі знаходзіцца шпілька для мацавання юбілейнага медаля да адзення.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
30.04.2024 № 183

УЗОР

пасведчання да юбілейнага медаля
”30 год Службе бяспекі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь“

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

**ПАСВЕДЧАННЕ**
**ДА ЮБІЛЕЙНАГА МЕДАЛЯ**

**”30 ГОД
СЛУЖБЕ БЯСПЕКІ
ПРЭЗІДЭНТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ“**




**ПАСВЕДЧАННЕ**

**УЗНАГАРОДЖАНЫ (А)
ЮБІЛЕЙНЫМ МЕДАЛЁМ**

**”30 ГОД
СЛУЖБЕ БЯСПЕКІ
ПРЭЗІДЭНТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ“**

**”………..“……..………20……г.**

**Начальнік
Службы бяспекі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь**

**М.П.**